ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 14 (848) ● Чацвер, 4 мая 1972 г. ● Год выдання XXV ● Цана 2 кап.

9 мая — Дзень Перамогі

ПАРТЫЯ — ПРАВАДЫР І ПАЛКАВОДЗЕЦ

Вялікая гістарычная перамога Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне — вынік паслядоўнага ажыццяўлення Камуністычнай партыяй ленінскага вучэння аб абароне сацыялістычнай Айчыны, заваёў сацыялізму. У цяжкую гадзіну выпрабаванняў яна паўстала перад народам як натхняючая і арганізуючая сіла. Перад тварам смяротнай небяспекі працоўныя нашай шматнацыянальнай Радзімы згуртаваліся пад баявым лозунгам партыі «Усё для краіны, усё для перамогі!».

У кароткі тэрмін пад кіраўніцтвам партыі адбылася нябачаная ў гісторыі перабудова народнай гаспадаркі на ваенны лад, вялікае перамяшчэнне вытворчых сіл з захаду на ўсход краіны. З ліпеня па лістапад 1941 года было эвакуіравана 10 мільёнаў чалавек і больш 1.360 буйных прадпрыемстваў.

Лепшыя сыны партыі былі на пярэднім краі ўзброенай барацьбы, паказвалі прыклад мужнасці і гераічнай адвагі ў баях. На працягу ўсёй вайны на франтах знаходзіліся асноўныя сілы партыі, больш паловы яе саставу. Калі ў гады грамадзянскай вайны на кожныя 100 байцоў Чырвонай Арміі прыходзілася 5 камуністаў, то ў канцы Вялікай Айчыннай — 25.

Партыя, яе Цэнтральны Камітэт накіравалі ў армію і на флот каля 50 тысяч кіруючых партыйных і савецкіх работнікаў. На фронт пайшло каля трэці саставу ЦК ВКП(б). Толькі ў лістападзе 1941 года ў дзеючыя войскі было накіравана 7 тысяч палітработнікаў.

Камуністы былі душой партызанскага, глыбока народнага руху. К сярэдзіне 1943 года на акупіраванай тэрыторыі краіны дзейнічалі 24 падпольныя абласныя, 222 уезныя, акружныя, гарадскія і раённыя камітэты партыі. У тым ліку ў Беларусі—10 абласных, 185 міжраённых, гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, 1.316 пярвічных арганізацый.

Наша партыя была сапраўды партыяй змагання. Камуністы цэментавалі рады арміі і флоту, з'яўляліся надзейнай апорай камандзіраў у рашэнні складаных баявых задач. Калі ў цяжкіх абставінах пад агнём праціўніка трэба было падняць салдат у атаку, гучаў заклік «Камуністы, наперад!» І першымі падымаліся на ворага воіны, якія бераглі ля сэрца партыйны білет або заяву са словамі: «Калі загіну, прашу лічыць мяне камуністам». І характэрна, што сярод воінаў, удастоеных за подзвігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны звання Героя Савецкага Саюза, каля 74 працэнтаў складаюць байцы ленінскай партыі. У ліку іх 300 афіцэраў-палітработнікаў.

Пад кіраўніцтвам партыі з гонарам вытрымаў суровыя выпрабаванні наш слаўны камсамол. У радах арміі і флоту ў пачатку вайны змагаліся 1,5 мільёна членаў ВЛКСМ, а ў канцы — 2,5 мільёна, 3,5 мільна маладых ленінцаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. У ліку Герояў Савецкага Саюза 11 працэнтаў — камсамольцы.

27 год прайшло з дня Вялікай Перамогі савецкага народа. За гэты час дзякуючы нястомным клопатам Камуністычнай партыі і намаганням працоўных нашай краіны Савецкія Узброеныя Сілы карэнным чынам змяніліся. Яны забяспечаны грознай зброяй і баявой тэхнікай, уключаючы ракетна-ядзерныя сродкі рознага калібра, атамны ракетаносны падводны флот, звышгукавую ракетную авіяцыю. Савецкія воіны — сапраўдныя майстры сваёй справы —настойліва павышаюць сваю баявую гатоўнасць, выконваючы задачы, пастаўленыя XXIV з'ездам КПСС.

Пятага мая — Дзень савецкага друку. Пачынаючы з 1922 года, ён штогод адзначаецца ў нас у азнаменаванне выхаду ў 1912 годзе першага нумара масавай рабочай газеты «Праўда», заснаванай У. І. Леніным. Дзякуючы пастаянным клопатам партыі друк краіны за гады Савецкай улады вырас у вялікую сілу, служыць зброяй камуністычнага будаўніцтва.

● У мінулым годзе ў СССР выдавалася каля 8.000 газет і больш 4.000 часопісных выданняў. Разавы тыраж усіх газет і часопісаў складае звыш 290 млн. экземпляраў. Газеты выдаваліся ў 1971 г. на 57 мовах народаў СССР. Больш 30 выданняў выходзіла мільённымі тыражамі. Налічвалася 4.450 паліграфічных прадпрыемстваў.

● Вялікіх размераў у сваім развіцці дасягнуў друк рэспублікі. Калі да 1917 года ў Беларусі не выходзіла ні адной газеты на роднай і лічаныя адзінкі на рускай мове, то ў цяперашні час у БССР выдаецца 11 рэспубліканскіх газет, 6 абласных, 11 аб'яднаных, 106 раённых, 2 гарадскія і 43 шматтыражныя. Агульны сярэднеразавы тыраж толькі рэспубліканскіх, абласных і раённых газет склаў на першае студзеня мінулага года 3.882.337 экземпляраў.

● У БССР выходзяць 56 часопісаў і выданняў часопіснага тыпу тыражом у 1.248.430 экземпляраў.

● Савецкі Саюз займае першае месца ў свеце па выпуску кніг: кожная чацвёртая з іх выходзіць у нашай краіне. Кожную мінуту ў СССР выпускаецца 3.000 экземпляраў кніг і брашур, у сярэднім па 4,7 млн. экземпляраў у дзень.

СВЯТА САВЕЦКАГА ДРУКУ



● У Беларусі ў 1970 годзе выдадзена 2.174 назвы кніг тыражом 25.170.500 экземпляраў. А за ўсю восьмую пяцігодку ў нас выйшла 9.639 назваў кніг. Іх агульны тыраж склаў 112.741 тысячу экземпляраў.

Верная запаветам Леніна, справе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, савецкая прэса няспынна змагаецца за здзяйсненне ідэалаў партыі, ствараючы яркі летапіс сучаснасці, выхоўваючы свядомых і перакананых будаўнікоў камунізму. Яе слаўныя ленінскія традыцыі — баявая камуністычная ідэйнасць і глыбокая партыйнасць, масавасць, цесная сувязь з жыццём народа, актыўны ўдзел у барацьбе за стварэнне новага грамадства—няўхільна мацнеюць і развіваюцца.

У гэтыя дні наш друк выступае як магутны сродак прапаганды рашэнняў XXIV з'езда КПСС, мабілізацыі працоўных на паспяховае іх ажыццяўленне.

Сардэчна віншуем з усенародным святам — Днём савецкага друку! Жадаем вам поспехаў у вучобе, працы і на журналісцкай ніве!

У Дзень друку рэдкалегія выказвае сваю асаблівую ўдзячнасць памочнікам газеты, яе актыўным карэспандэнтам: Леаніду Екелю, Наташы Салук, Віктару Жуку, Уладзіміру Скульбедаву, Івану Сцяпуру, Пятру Дзетліковічу, Тамары Філімонавай, Георгію Чыгіру, Леаніду Петэрсону, Георгію Кісялёву, Міхаілу Вяргейчыку, Мікалаю Калянковічу, рэдкалегіям насценных газет «Віта» і «Алгарытм».

Чакаем ад вас, сябры, новых цікавых матэрыялаў.

РЭДКАЛЕГІЯ ШМАТТЫРАЖКІ.

ДАРАГІЯ СЯБРЫ ГАЗЕТЫ!

ГРАМАТА МІНІСТЭРСТВА — ЗАГАДЧЫКУ ЛАБАРАТОРЫІ

Прыемная вестка прыйшла на факультэт журналістыкі напярэдадні Дня друку. Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР узнагародзіла граматай загадчыка лабараторыі радыё і тэлебачання Рыгора Аляксеевіча Жураўлёва за актыўны ўдзел у навукова-метадычнай і эксперыментальна-канструктарскай рабоце па прымяненню у вучэбным працэсе тэхнічных сродкаў і праграміраванага навучання.

Грамату Р. А. Жураўлёву ўрачыста ўручыў на партыйным сходзе дэкан факультэта Р. В. Булацкі.

А. АРЛОЎ.

1941—1945

1.418 дзён, з 22 чэрвеня 1941 па 9 мая 1945 года, працягвалася Вялікая Айчынная вайна савецкага народа і яго ўзброеных абаронцаў супраць фашысцкай Германіі і яе сатэлітаў. Велічнымі гістарычнымі вехамі на шляху да перамогі сталі:

— БІТВА ПАД МАСКВОЙ (абарона сталіцы Радзімы — з 30 верасня па 5 снежня 1941 года, разгром і паражэнне ворага — са снежня 1941 па красавік 1942 г.), развеяўшая міф аб непераможнасці нямецка-фашысцкай Германіі, — першае вялікае паражэнне ворага ў другой сусветнай вайне. Яна з'явілася пачаткам карэннага пераломту ў ходзе вайны;

— ГРАНДЫЁЗНАЯ СТАЛІНГРАДСКАЯ БІТВА (контрнаступленне савецкіх войск з 19 лістапада 1942 г. па 2 лютага 1943 г.) — буйнейшая ваенна-палітычная падзея, азнаменаваўшая карэнны пералом як у ходзе Вялікай Айчыннай, так і ўсёй другой сусветнай вайны. Гэта была апе-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

РАЗМОВА АБ ПРАФЕСІІ



— Калі я іду здымаць па заданню, то пры мне звычайна некалькі фотаапаратаў з наборам аб'ектываў. І ведаеце, мне не цяжка. Гэта ж мае сябры. Бывае, трэба рабіць здымак з дрэва, як было ў Белавежскай пушчы, 20 метраў уверх па суках — дробязь! Мне ж 17 гадоў...

Сінява вачэй, павялічаных шклом акуляраў, і 60 гадоў дзіўна і прыгожа спалучаюцца ў вядомага ў нашай краіне і за мяжой беларускага фотакарэспандэнта Міхаіла Пятровіча Ананьіна. Мір і вайна — дзве тэмы, якія хвалююць яго больш за ўсё. Разам з жонкай Аляксандрай Канстанцінаўнай ён выканаў многа работ, прысвечаных гэтым тэмам. Найбольш вядомыя фотанарысы — «Хатынь», «Брэсцкая крэпасць», «Белавежская пушча» — Міхаіл Пятровіч паказаў на сустрэчы са студэнтамі факультэта журналістыкі.

Хатынь і Брэсцкая крэпасць — згустак чалавечай трагедыі і чалавечай мужнасці, рэквіем загінуўшым у барацьбе, гераічная песня —такімі паўстаюць яны ў фотаработах М. П. Ананьіна.

А белавежскае цуда глядзіць на нас стрэламі-праменнямі ўзыходзячага паміж магутных дубоў сонца, манументальнай задуменнасцю зубра, гордым росчыркам рог лася...

— Фатаграфія павінна перадаваць усе колеры жыцця, усе адценні — гэта я магу параіць тым, хто захапляецца фотаздымкай, — сказаў Міхаіл Пятровіч.

Перад студэнтамі выступілі таксама старшыня фотасекцыі Саюза журналістаў БССР В. Л. Марцыёнка, фотакарэспандэнт часопіса «Работніца і сялянка» У. П. Віхотка.

Яны расказалі аб сваіх прыёмах у творчай працы, далі карысныя парады і пажадалі поспехаў будучым журналістам.

А. ЦЫГАНКОВА, студэнтка I курса факультэта журналістыкі.

На здымках: (уверсе, злева направа) выкладчык кафедры РТ Г. З. Бягун, В. Л. Марцыёнка і У. П. Віхотка; (злева) М. П. Ананьін.

Фота А. Сапёрава.

1941—1945

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

рацыя, якая па выніках не мела сабе роўных у гісторыі войн. Перамога на Волзе паклала пачатак агульнаму разгрому фашысцкіх захопнікаў. Пасля яе Чырвоная Армія канчаткова захапіла стратэгічную ініцыятыву ў свае рукі;

— БІТВА НА КУРСКАЙ ДУЗЕ (абарона савецкіх войск з 5 па 23 ліпеня 1943 г., контрнаступленне — да 23 жніўня 1943 года) — адна з буйнейшых бітваў другой сусветнай вайны, бітва, пасля якой завяршыўся карэнны пералом у ходзе вайны. Стратэгічная ініцыятыва трывала была замацавана за Узброенымі Сіламі СССР, а гітлераўскае камандаванне вымушана было канчаткова адмовіцца ад наступальнай стратэгіі і перайсці да абароны на ўсім савецка-германскім фронце;

— НАСТУПАЛЬНЫЯ АПЕРАЦЫІ 1944 года, у тым ліку Беларуская аперацыя, у выніку якіх Савецкія Узброеныя Сілы вышвырнулі гітлераўскія войскі з межаў роднай краіны, пачалі вызваленне народаў іншых краін ад фашысцкага іга;

— БІТВА ПАД БУДАПЕШТАМ І ВЕНАЙ, аперацыі НА ВІСЛЕ І ОДЭРЫ, іншыя наступальныя аперацыі, у ходзе якіх Узброеныя Сілы СССР разгромілі ворага, з гонарам выканалі сваю вызваленчую місію;

— апафеоз вайны — БЕРЛІНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ (16 красавіка — 8 мая 1945 г.). 1 мая 1945 года савецкія войскі ўзнялі сцяг Перамогі над рэйхстагам. 8 мая вярхоўным германскім камандаваннем быў падпісан акт аб безагаворачнай капітуляцыі германскіх войск.

У разгром гітлераўскіх полчышч вялікі ўклад унеслі ПАРТЫЗАНЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ. Усяго актыўных удзельнікаў барацьбы з фашысцкімі акупантамі, уваходзіўшых у састаў партызанскіх фарміраванняў, падпольных арганізацый і скрытых рэзерваў, на захопленай ворагам савецкай тэрыторыі налічвалася 1 мільён 933 тысячы чалавек.

ЛЕКЦЫІ, ГУТАРКІ, СУСТРЭЧЫ

Свята Перамогі шырока адзначаецца ва універсітэцкім калектыве. Са студэнтамі, якія праходзяць ваенную падрыхтоўку, куратары праводзяць гутаркі аб перамозе савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дэканаты, партыйныя бюро факультэтаў, камітэт камсамола, ваенная кафедра арганізуюць экскурсіі студэнтаў у Хатынь, на Курган Славы і ў іншыя памятныя месцы.

На факультэтах пройдуць урачыстыя сходы. Перад студэнтамі выступяць ветэраны вайны. У актавай зале будзе арганізаван паказ кінафільмаў «Падзенне Берліна», «Апошні штурм».

Сёння пачынаецца тыдзень абаронна-масавай работы, прысвечаны Дню Перамогі. Студэнты сустрэнуцца з Героямі Савецкага Саюза і ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны ў Доме ДТСААФ, прымуць удзел у спаборніцтвах па кулявой стральбе і радыёспорту.

9 мая на магілы ахвяр фашызму ў Масюкоўшчыне, Трасцянцы, да мемарыяльнай дошкі памяці студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, загінуўшых у баях, будуць ускладзены вянкі і кветкі.

РАДЗІМА ПАМЯТАЕ СВАІХ ГЕРОЯЎ

ДЗЕЛЯ СЁННЯШНЯГА ДНЯ

Чалавек працы ніколі не губляе сваёй унутранай прыгажосці, калі ён аддае сваёй справе ўсе сілы і энергію, калі для яго праца — гэта і ёсць жыццё.

Ужо 26 год працуе ў нашым універсітэце на хімфаку Сямён Гаўрылавіч Ягораў. Гэта перыяд мірнай працы ў біяграфіі ветэрана Вялікай Айчыннай вайны. А вось нядаўняя ўзнагарода — ордэн Славы III ступені за баявыя заслугі ў перыяд вайны— заставіла ўспомніць былое.

Якім жа быў лёс гэтага чалавека з простым, адкрытым тварам, на якім тугімі рубцамі засталіся сляды баёў?

...Вайна. Папялішчамі пакрылася зямля, палыхалі гарады ад бамбёжкі, гінулі людзі. Нянавісць пранізвала сэрцы салдат, якія вымушаны былі з баямі адступаць. Сярод іх і Сямён Гаўрылавіч Ягораў.

Танк «Т-26», экіпажам якога камандаваў Сямён Гаўрылавіч, рухаўся па мінскай дарозе ў кірунку Старога Барысава. На Беразіне завязаліся жорсткія баі. Савецкія воіны ўсімі сіламі імкнуліся стрымаць націск ворага. Неўзабаве моцны выбух скалануў паветра, і танк «Т-26» успыхнуў. Рэзкі боль пранізаў ногі камандзіра, у радыста быў апален увесь твар, механік-вадзіцель корчыўся ад болю, паранены ў жывот.

У Вязьме аказалі раненым дапамогу, а затым перавезлі ў Серпухаў. Так іх разлучыла вайна. Нават невядома, ці засталіся ў жывых яго сябры.

Шмат каляін пралажылі гусеніцы танка Сямёна Гаўрылавіча па роднай зямлі і па зямлі многіх краін. У 1944-45 гадах ён ваяваў ва ўсходняй Прусіі, дзе быў зноў паранен.

Вестку аб перамозе С. Г. Ягораў пачуў у Маскве. Тут танкавы полк астанавіўся на вакзале на трое сутак, і воіны з радасцю і гонарам за сваю Радзіму глядзелі пераможны салют.

Эшалоны стаялі ў гатоўнасці, але салдатамі ўжо валодала пачуццё вяртання дамоў, хуткай сустрэчы з роднымі.

Раптам быў атрыман загад рухацца на Усход. Танк Сямёна Гаўрылавіча прадоўжыў свой цяжкі баявы шлях.

У 1946 годзе Сямён Гаўрылавіч быў дэмабілізаван і прыехаў у Мінск...

Просты, сціплы, ён не вельмі ахвотна расказвае аб сваіх заслугах, бо лічыць, што кожны на яго месцы павінен быў бы аддаць усе свае сілы і ўменні дзеля перамогі, дзеля нашага сённяшняга шчасця.



М. МАЦЕЙКА,
студэнтка.

ЗАЎСЁДЫ Ў СТРАІ

Сёння доктару філалагічных навук прафесару М. Р. Ларчанку ўжо за 60. Яго працы па гісторыі станаўлення і развіцця рэалізму ў беларускай літаратуры, аб беларуска-славянскіх літаратурных сувязях добра вядомы ў навуковым свеце. Не адно пакаленне студэнтаў назаўсёды запомніла яго цікавыя лекцыі. Больш 30 кандыдатаў і дактароў навук — яго выхаванцы — аддаюць яму даніну падзякі за сваё творчае станаўленне. Паэты, празаікі, настаўнікі і сённяшнія студэнты — усе ведаюць яго як чалавека шчодрай душы, па-маладому бадзёрага, адкрытага і шчырага. Шматлікімі падзякамі і ўзнагародамі адзначана яго багатая праца як педагога, так і літаратара. А зусім нядаўна ўрад краіны ўзнагародзіў яго ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Гэта ўзнагарода—ацэнка мужнасці і адвагі Міхася Рыгоравіча ў гады вайны. Яна нагадвае дні фашысцкай навалы, жорсткія франтавыя баі, цяжкае раненне, а пасля зноў бітвы, бітвы за вызваленне. Апошняя ваенная дарога нарэшце прывяла Міхася Рыгоравіча ў 1943 годзе на падмаскоўную станцыю Сходня, дзе пачынаў набіраць сілы і аднаўляць сваю работу наш Беларускі універсітэт. З гэтага часу кожны дзень М. Р. Ларчанкі моцна знітаваны з філалагічным факультэтам, з яго уздымам і росквітам. Доўгі час ён быў яго дэканам, а пасля загадчыкам кафедры беларускай літаратуры. Каля 30 год! І сёння ўсю сваю невычэрпную энергію ён аддае калектыву, моладзі.



Для Васіля Фёдаравіча Чыгіра шлях да перамогі пачаўся ў партызанскім злучэнні. Потым ён удзельнічаў у баях за вызваленне Прыбалтыкі. Быў цяжка паранен, аднак знайшоў у сабе сілы, каб вярнуцца да актыўнай працы і напружанай вучобы.

Цяпер доктар юрыдычных навук В. Ф. Чыгір вучыць і выхоўвае студэнцтва і вядзе вялікую грамадскую работу.

А нядаўна за самаадданую ратную працу ў суровы ваенны час В. Ф. Чыгір узнагароджан ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



На здымку: М. Р. ЛАРЧАНКА (фота 1942 г.)

ЗАСТАНУЦЦА Ў ПАМЯЦІ

Значную работу па выхаванню ў студэнтаў савецкага патрыятызму праводзяць супрацоўнікі нашай бібліятэкі. Прывіць пачуццё гордасці за сваю Радзіму, за свой народ, за яго вялікія здзяйсненні, рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя справы — усяму гэтаму яны адводзяць вялікае месца ў грамадскіх мерапрыемствах. Канферэнцыі, дыспуты, сустрэчы з аўтарамі і героямі кніг пакідаюць глыбокі след у свядомасці студэнтаў.

Незабыўнымі застануцца і дыспуты, якія правялі супрацоўнікі бібліятэкі разам з ваеннай кафедрай, па ваенна-патрыятычнай тэматыцы ў красавіку месяцы. У аснову іх былі пакладзены кнігі «Штурм» В. Вашуніна, «Адкрыты лік» А. Меднікава, «Маскоўская нядзеля» К. Ларыёнавай, «Лейтэнант Арцюхоў» С. Круціліна, «Чалавек і зброя» А. Ганчара, «Гарачы снег» Ю. Бондарава, «Вайна адыходзіць на захад» Л. Крывашчокава, «Апошняе лета» К. Сіманава, «Змена каравулаў» А. Кузьмічова, «Пяць крокаў жыцця» М. Новікава і іншыя.

На абмеркаванне кнігі «Пяць крокаў жыцця» да студэнтаў прыйшоў У. Юрэвіч, які зрабіў літаратурны запіс ад аўтара і быў рэдактарам твора. Ён расказаў, што Герой Савецкага Саюза Мікалай Мікітавіч Новікаў, праяўляючы мужнасць і гераізм у час вайны, быў цяжка паранен. З 1949 года ён прыкаван да пасцелі, але не траціць жыццёвай сілы, вядзе грамадскую работу, перапісваецца з моладдзю, з баявымі сябрамі.

Студэнты універсітэта, якія выступалі ў спрэчках па кнізе, напісалі пісьмо яе аўтару. У ім, у прыватнасці, гаворыцца: «...Калі для нашай Радзімы наступяць цяжкія дні, то мы, Мікалай Мікітавіч, будзем абараняць яе да апошняй кроплі крыві. Мы не зганьбім славы рускай зброі! Дзякуй Вам за такую цудоўную кнігу».

У кожным выступленні студэнтаў на дыспутах гучала адна думка: савецкі патрыятызм, бязмежная любоў да Радзімы пастаянна былі сілай, якая параджала масавы гераізм, душэўную прыгажосць савецкага чалавека, яго імкненне да вялікіх здзяйсненняў у імя Айчыны.

А. РУКШЫН,
супрацоўнік бібліятэкі.
Н. НАСОНАЎ,
выкладчык ваеннай кафедры.

«ВІТА»

ДАРОГІ, ЯКІЯ МЫ ВЫБІРАЕМ

Цяпер у пяцікурснікаў самая гарачая і напружаная пара — завяршэнне дыпломных работ. Як жа абстаяць справы ў іх? Каб даведацца аб гэтым, мы задалі выпускнікам наступныя пытанні:

1. Якая тэма вашай дыпломнай работы?

2. Калі мы прыходзім на біяфак, то маем даволі павярхоўнае ўяўленне аб біялогіі. Якім шляхам адбывалася ваша паглыбленне ў біялогію?

3. Ці пацярпела з-за вузкай спецыялізацыі шырыня вашага кругагляду?

4. Як фарміраваўся ваш характар у гады вучобы на біяфаку?

5. Хто з выкладчыкаў факультэта аказаў на вашу «эвалюцыю» асаблівы моцны ўплыў?

6. Праз некалькі тыдняў вы развітаецеся з універсітэтам. Якім будзе ваш апошні студэнцкі тост?

Л. ГУБСКАЯ (кафедра сістэматыкі раслін):

1. «Альдалагічная характарыстыка некаторых азёр Беларусі». Гэтыя азёры зусім не даследаваны, мы ўпершыню даём звесткі аб іх флоры і фауне. Работа вельмі важная, таму што ёсць намер выкарыстаць гэтыя азёры для зарыблення.

2. Звычайна выбар спецыялізацыі студэнт пачынае рабіць з II—III курса. Я спачатку хадзіла амаль ва ўсе гурткі, цікавілася рознымі галінамі біялогіі. На гэтай кафедры аказалася дзякуючы Валянціне Канстанцінаўне Гаравец. Вельмі хацела трапіць да яе, вельмі падабаецца яе праца. Маё жаданне споўнілася.

3. Работа вельмі карпатлівая, але гэта не перашкаджае мне чытаць літаратуру, любіць тэатр, кіно. Мая праца патрабуе многа часу, трэба вельмі яе любіць, каб ёю займацца!

4. На першым курсе ўсе былі чужымі. Першае поўнае ўяўленне аб нашым калектыве ў мяне склалася пасля першай летняй практыкі. Цяпер шкада развітвацца з курсам, з універсітэтам, сумна... За гэтыя пяць год змяніўся ў нечым мой характар, я стала больш вытрыманай, сур'ёзнай, лепш пазнала людзей, адносіны паміж імі. Тут я нібы прайшла школу жыцця.

5. Кожны выкладчык у нейкай меры аказвае ўплыў, кожны пакідае нейкі след. Але больш за ўсё гэта адносіцца да Валянціны Канстанцінаўны Гаравец. Пад яе уплывам я стала больш строга і крытычна адносіцца да сябе, да сваіх учынкаў. Пры ёй стараешся неяк падцягнуцца, стаць такой, як яна.

6. Каб студэнцкая жыццярадаснасць захавалася як мага даўжэй, назаўсёды.

Л. БАЛВАНОВІЧ (кафедра заалогіі пазваночных):

1. «Уплыў інтэнсіўнасці харчавання на развіццё моладзі ў рыб». Вялізная колькасць рыбы гіне на ранняй стадыі развіцця. Значыць, мая работа ўносіць уклад у вялікую справу.

2. Адносна выбару кафедры ў мяне ніякіх ваганняў не было. Я паступаў на біяфак з цвёрдым перакананнем, што тут займаюцца толькі заалогіяй пазваночных. Рыбай асабліва не цікавіўся, але, як кажуць, апетыт прыходзіць у час ежы. Цяпер так уцягнуўся ў работу, нібы ўсё жыццё марыў аб рыбах.

3. Маё хобі — жывапіс і паляванне. Пры першай магчымасці бяру эцюднік.

4. Раней я жыў далёка ад людзей, хадзіў за пяць кіламетраў адзін у школу, марыў жыць у лесе, у хаціне. Цяпер я ў многім змяніўся. У калектыве вельмі многаму вучышся, толькі ў ім чалавек спазнае нормы паводзін. Фарміраванне майго характару адбывалася ў пакоі інтэрната. Я стаў больш гуманна адносіцца да людзей.

5. Драко Міхаіл Міхайлавіч, добры, разумны, вопытны чалавек.

6. Дзякуй.

інтэрв'ю ўзяла
Т. СМІРНОВА.

НЕ СТАРЭЮЦЬ ВЕТЭРАНЫ

Даўно адгрымела вайна, а ветэраны, прайшоўшыя са славай па яе дарогах, па-ранейшаму ў страі, толькі цяпер у мірным страі будаўнікоў камунізму. Яны не толькі добрасумленна працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі, навукі, культуры, асветы, але і вядуць вялікую грамадскую работу.

Савет ветэранаў вайны БДУ, які ўзначальвае Герой Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў, і секцыі савета на факультэтах актыўна ўдзельнічаюць у ваенна - патрыятычным выхаванні студэнтаў, выступаюць з лекцыямі і гутаркамі ў студэнцкіх аўдыторыях і інтэрнатах, з'яўляюцца актыўнымі прапагандыстамі подзвігу савецкага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Нядаўна, напрыклад, на фізічным факультэце па ініцыятыве савета і секцыі адбылася канферэнцыя па кнізе маршала І. Х. Баграмяна «Так пачыналася вайна». Выступілі тут не толькі чытачы, а і ўдзельнікі баёў, апісаных у кнізе маршала. Супрацоўнік універсітэта Міхаіл Іванавіч Аносаў, які з першага дня аказаўся ў віхуры вайны, расказаў аб цяжкім і мужным шляху з акружэння. Ягор Андрэевіч Піскуноў, супрацоўнік фізфака, успомніў аб франтавых буднях. Вартасцям кнігі прысвяцілі сваё выступленне Аляксандр Васільевіч Кірсанаў і іншыя ўдзельнікі канферэнцыі.

Заслугі ветэранаў вайны БДУ высока ацэнены Савецкім камітэтам ветэранаў вайны. За актыўны ўдзел у рабоце па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі 13 супрацоўнікаў універсітэта ўзнагароджаны граматамі, 17 — знакам выдатніка і пяць — ганаровым нагрудным знакам.

Ганаровых узнагарод удастоены старшыня савета ветэранаў А. В. Кірсанаў, дэкан фізічнага факультэта І. П. Зяцькоў, прарэктар БДУ С. А. Умрэйка, сакратар парткома М. К. Гарбачоў, супрацоўнік фізфака Я. А. Піскуноў, дацэнт Т. І. Прытыцкая, Герой Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі, прафесар В. Р. Заўрыеў, старшы лабарант Н. П. Козыр і многія іншыя.

А. АЛЕНІЧ.

ВЫХОЎВАЦЬ ПАТРЫЁТАЎ

Савецкі народ паспяхова ажыццяўляе распрацаваную XXIV з'ездам праграму далейшага эканамічнага і сацыяльнага развіцця нашай Радзімы, стварае матэрыяльна-тэхнічную базу камунізму.

Грандыёзныя задачы будаўніцтва, складанае міжнароднае становішча, у якім развіваецца творчая дзейнасць савецкага народа, пастаянна патрабуюць неаслабнай увагі да фарміравання новага чалавека, прадуманых, паслядоўных і актыўных практычных дзеянняў для здзяйснення задач камуністычнага выхавання.

Важнейшым напрамкам агульнай праграмы « камуністычнага выхавання, асабліва актуальным у сучасных умовах, з'яўляецца работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню.

У Праграме КПСС запісана, што «партыя выхоўвае ўсіх камуністаў, усіх савецкіх людзей у духу пастаяннай гатоўнасці да абароны сацыялістычнай Айчыны, любві да сваёй арміі».

Выхаванне савецкага патрыятызму, любві да нашай сацыялістычнай Радзімы, да Камуністычнай партыі Савецкага Саюза — важнейшая, першачарговая задача ідэалагічнай работы.

Уся гісторыя існавання савецкай сацыялістычнай дзяржавы пераканаўча сведчыць, што палымяны савецкі патрыятызм з'яўляецца невычэрпнай крыніцай мужнасці, самаадданасці і гераізму савецкіх людзей у іх працоўных і ратных справах у імя камунізму.

Савецкі патрыятызм з'яўляецца адной з галоўных рухаючых сіл развіцця нашага грамадства, а патрыятычнае выхаванне — адным з « важнейшых напрамкаў фарміравання новага чалавека.

Асаблівую ўвагу КПСС удзяляе пытанням патрыятычнага выхавання моладзі. XXIV з'езд партыі ў сваёй рэзалюцыі зноў пацвердзіў, што «ўся справа адукацыі і выхавання моладзі павінна служыць фарміраванню ў новых пакаленняў камуністычных перакананняў і маралі, бязмежнай адданасці сацыялістычнай Радзіме». Савецкая моладзь — вялікая грамадска-палітычная, стваральная, творчая сіла ў барацьбе за ўсталяванне камунізму. «Без удзелу моладзі ў грамадска-палітычным жыцці краіны, указваў Л. І. Брэжнеў у сваёй прамове на XVI з'ездзе ВЛКСМ, мы не можам паспяхова рухацца наперад».

Велічныя планы камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне ў якасці аднаго са сваіх важнейшых элементаў прадугледжваюць падрыхтоўку і выхаванне кадраў высококваліфікаваных спецыялістаў. Ад якасці іх прафесіянальнай падрыхтоўкі і камуністычнага выхавання, атрыманых у навучальных установах, у вялікай меры залежыць своечасовае і паспяховае рашэнне задач камуністычнага будаўніцтва. Разам з тым вышэйшая школа — надзейны рэзерв, адкуль армія і флот пастаянна атрымліваюць высококваліфікаваных спецыялістаў. Выпускнікі вну, прайшоўшыя ў іх ваенную падрыхтоўку і вытрымаўшыя ўстаноўленыя экзамены, папаўняюць запас афіцэрскага саставу Савецкіх Узброеных Сіл. Яшчэ больш узрасла роля вышэйшай школы ў гэтым « напрамку пасля прыняцця Вярхоўным Саветам СССР 12 кастрычніка 1967 года Закона аб усеагульнай воінскай павіннасці. Закон патрабуе больш удзяляць увагі падрыхтоўцы студэнцкай моладзі да ваеннай службы, паляпшаць яе ваенна-патрыятычнае выхаванне.

Партыйныя і грамадскія арганізацыі нашага універсітэта вядуць вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі, імкнуцца глыбока, на навуковай аснове, вывучаць дзейснасць тых ці іншых выхаваўчых прыёмаў. У ходзе такога вывучэння, напрыклад, выявілася вялікае выхаваўчае значэнне экскурсій ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Экскурсіі мэтанакіравана і настойліва рыхтаваліся. Старанна прадумваліся пытанні больш эфектыўнага выкарыстання музейнага фонду для лепшага і пераканаўчага раскрыцця падзей Вялікай Айчыннай вайны. На сустрэчу са студэнцкай моладдзю запрашаюцца ветэраны, аб подзвігах якіх расказваецца ў экспазіцыях. Шматлікія, часта ўжо вядомыя факты атрымліваюць у гэтых расказах кваліфікаваную ацэнку непасрэдных удзельнікаў бітваў, што ў вялікай ступені павялічвае пераканаўчасць выкладаемага матэрыялу, яго інтэлектуальнае і эмацыянальнае ўздзеянне.

Традыцыйнымі сталі тыдні памяці герояў, месячнік абаронна-масавай работы. Асаблівая ўвага ўдзяляецца развіццю ваенна-прыкладных відаў спорту. Арганізацыі ДТСААФ універсітэта выступілі ініцыятарамі саборніцтва за дастойную сустрэчу 50-годдзя СССР. Праведзена звыш 30 спаборніцтваў па стралковаму спорту. Асабліва вялікі размах абаронна-масавая работа атрымала пасля ўводу новага « комплексу ГПА.

Шырока прыцягваюцца студэнты да актыўных форм ваенна - патрыятычнай работы. Пры камітэце камсамола універсітэта створаны штаб групы «Доўг» і яго секцыі на факультэтах. Усе яны актыўна ўключыліся ў пошук матэрыялаў аб выкладчыках і студэнтах універсітэта, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Штаб групы ўзначальвае студэнт III курса факультэта журналістыкі Леанід Екель.

Студэнты факультэта журналістыкі і гістарычнага пачалі работу па падрыхтоўцы зборніка «Яны змагаліся за Радзіму» — аб выкладчыках і супрацоўніках універсітэта, якія гераічна змагаліся з ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Студэнты старэйшых курсаў актыўна ўдзельнічаюць у лекцыйнай ваенна-патрыятычнай прапагандзе на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах рэспублікі, у стварэнні стэндаў, « куткоў баявой і працоўнай славы, фотавыставак і г. д.

Вялікая ўвага ўдзяляецца навукова-даследчай рабоце студэнтаў па ваенна-патрыятычнай тэматыцы. Многія студэнцкія даследаванні па ваенна-патрыятычнай тэматыцы ўдастоены дыпломаў на рэспубліканскіх і саюзных конкурсах.

Ваенна-патрыятычная работа дапамагае прывіваць студэнтам якасці арганізатара і выхавацеля мас, вельмі неабходных будучым спецыялістам, якія павінны умець «рашаць, як адзначаў Л. І. Брэжнеў на Усесаюзным злёце студэнтаў, не толькі навукова-тэхнічныя і гаспадарчыя задачы, але і задачы палітычныя, арганізатарскія, рашаць кампетэнтна, з веданнем справы, кіраваць калектывамі, выкарыстоўваючы і развіваючы ўсе іх творчыя магчымасці».

У бягучым годзе значна актывізавалі работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню савет ветэранаў вайны і яго секцыі на факультэтах. Разам з тым у гэтай важнай рабоце ёсць і недахопы. Не ўсе дэканаты, партыйныя і камсамольскія арганізацыі, камітэты ДТСААФ факультэтаў « актыўна ўдзельнічаюць у абаронна-масавай рабоце і ваенна-патрыятычным выхаванні. Не выкарыстаны ўсе магчымасці для расшырэння кантактаў студэнцкай моладзі з воінамі Савецкіх Узброеных Сіл, а таксама па развіццю ваенна-прыкладных відаў спорту.

Доўг партыйных, грамадскіх арганізацый універсітэта дабіцца ліквідацыі недахопаў, якія ёсць у ваенна-патрыятычным выхаванні, узняць гэтую работу на ўзровень патрабаванняў XXIV з'езда КПСС.

І. МАРЧАНКА,
член партыйнага камітэта БДУ імя У. І. Леніна.

СХІЛЯЮЧЫ ГАЛОВЫ

ДОЎГ

Паміраюць тыя, аб кім забываюць. Іх не забылі, іх проста не ведаюць. А калі і ведаюць, то вельмі нямногія...

На жаль, скупыя, вельмі скупыя звесткі аб гэтых людзях.

Цяпер, калі прайшлі гады, усё цяжэй вяртацца да мінулага. Цяжэй успомніць твар чалавека. Сціраюцца ў памяці прозвішчы блізкіх людзей, забываюцца іх імёны. Але калі кранеш нябачныя струны, абудзіш успаміны, зусім іншым становіцца твар чалавека, па-іншаму гучыць яго голас. Быццам глыбока пад сэрцам абуджаецца паўзабытая мелодыя, то сумная, то трывожна-ўсхваляваная, як званы Хатыні...

Кароткія, вельмі кароткія звесткі.

...Іван Рыбакоў. Ён быў сакратаром камітэта камсамола універсітэта. Цудоўны хлопец з Віцебскай вобласці, студэнт гістарычнага факультэта. Заданне, якое атрымаў Рыбакоў восенню 1943 года, было апошнім. Ён з поспехам выканаў яго, але ў Маскву не вярнуўся. Іван Рыбакоў, мужны разведчык, загінуў 14 верасня 1943 года.

...У заснежаным полі пад Мажайскам, адбіваючы танкавую атаку, загінуў студэнт геаграфічнага факультэта, член камітэта камсамола, выдатнік вучобы Леанід Сокал. Пяць фашысцкіх танкаў нерухома застылі на белым полі пад Мажайскам.

...Вызваляючы родную Беларусь, загінулі добраахвотнікі-дэсантнікі, студэнты гістарычнага факультэта Мікалай Бабчынскі і Афанасій Наліваіка.

...У фашысцкіх засценках былі закатаваны студэнты геаграфічнага факультэта Сяргей Гуляеў і Алік Суша.

...У лагеры смерці Асвенцыме фашысты замучылі студэнтку II курса геафака Ніну Абрамовіч.

...У 1944 годзе перад самым вызваленнем роднай Беларусі ад фашысцкай нечысці былі расстраляны не схіліўшыя галавы перад ворагам падпольшчыкі Яўген Міхаілавіч Зубковіч, дацэнт, загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі, Анастасій Васільевіч Вязовіч, дацэнт біяфака, асістэнт Зіна Завістовіч.

«...Абараняючы Гомель, загінуў студэнт IV курса геаграфічнага факультэта Косця Некрашэвіч.

...Пад гераічным Ленінградам аддаў сваё жыццё старшы лейтэнант, студэнт геаграфічнага факультэта Мікалай Кукарэка.

...Загінулі на палях вялікай бітвы за Радзіму выкладчык гістарычнага факультэта Т. С. Сталярова, дацэнт геаграфічнага факультэта В. Е. Зудзілін і аспірант Г. С. Крэснікаў, студэнты гістфака Г. Млоцін, Т. Залуцкая, В. Бабароўскі. П. Назараў, Т. Шчасны, Б. Даўгулевіч, Ф. Глінскі, В. Віткоўская, студэнты хімічнага факультэта Т. Драбышэўская, Д. Корсік, М. Сяргейчык, А. Будаіі, А. Балашоў, А. Тумілоўіч, К. Шыцік. Яны не дажылі да шчаслівага дня Перамогі, але наблізілі гэты дзень...

Калі называеш іх студэнтамі, прыходзіць адчуванне, што яны жывыя, побач, толькі на розных курсах, на розных факультэтах...

Мы павінны ведаць аб гэтых людзях усё. І тады яны сапраўды будуць з намі. Ва ўсіх нашых урачыстасцях і ў нашых сэрцах. Мы многім ім абавязаны... Кожны дзень вядуцца пошукі матэрыялаў аб людзях, перад якімі мы ў пашане схіляем галовы.

Л. ЕКЕЛЬ,
старшыня штаба групы «Доўг».

«ЦАЛІННІК»

Сакавік 1963 года. Ва ўсіх карпусах з'явілася некалькі незвычайная аб'ява: «Друг! Калі ты моцны душой і целам, давай на цаліну! Кацёл агульны. Камфорта не абяцаем, але работы, сонца і весялосці — ўдосталь! Камітэт камсамола. Штаб працоўных спраў».

З гэтай аб'явы і пачалося фарміраванне студэнцкага атрада «Вікторыя»...

Першая цаліна, першая проба сіл на будоўлі пад спякотным сонцам Казахстана. Вось адно з пісем студэнта-цалінніка 1963 года:

З ГІСТОРЫІ АТРАДА

«Дарагія сябры! Вось ужо цэлы месяц мы на цаліне, накапілася мноства ўражанняў, многа новага. Ёсць і цяжкасці і свае радасці. Лёгкага жыцця нам ніхто не абяцаў. Тут ні мяккай пасцелі, ні асфальтаваных вуліц, ні тралейбусаў, ні тратуараў. Але затое тут ёсць вясёлы, ніколі не сумуючы народ. І нічога, што прыходзіцца падымацца ранкам у шэсць, што працуем па 10—12 гадзін у дзень, што выхадных амаль няма. Часта баліць спіна, ад стомы ныюць рукі. Але якой радасцю і гордасцю напаўняецца сэрца, калі ў стэпе ўбачыш белыя домікі, пабудаваныя табой і тваімі таварышамі».

У 1963, 1964, 1965 і 1966 гадах атрад «Вікторыя» выходзіў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве атрадаў, працаваўшых у Паўночным Казахстане. Ён узнагароджан Ганаровым сцягам ЦК ЛКСМ Казахстана.

У студэнцкім атрадзе «Вікторыя-72» — 40 байцоў, 9 з якіх ужо два разы ўдзельнічалі ў працоўным семестры, 22 пабывалі па разу, 9 — навічкі.

У. РАСОХІН,
камандзір атрада «Вікторыя-72».

Значнае месца ў праграме па курсу «Савецкі Саюз» на падрыхтоўчым факультэце адводзіцца вывучэнню матэрыялаў перыядычнага друку нашай краіны.

НА ЗДЫМКУ: з газетай «Известия» знаёмяцца студэнты-в'етнамцы.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

ПА ЮБІЛЕЙНАЙ ТЭМАТЫЦЫ

У студэнцкіх аўдыторыях, на прадпрыемствах горада і ў падшэфных раёнах гучаць у гэтыя дні галасы лектараў — членаў таварыства «Веды» БДУ. Іх палымянае слова аб слаўным юбілеі СССР.

Карыстаюцца вялікай папулярнасцю калектыўныя выхады вучоных БДУ на прамысловыя прадпрыемствы. Адзін з такіх выхадаў адбыўся нядаўна. Выкладчыкі юрфака, гістфака і кафедры палітэканоміі сустрэліся з рабочымі і інжынерамі завода імя Арджанікідзе. Дацэнт С. Р. Віхараў, выкладчыкі Л. А. Міхайлоўскі, Е. М. Саўчук, А. І. Якавенка, Т. І. Адамовіч выступілі з лекцыямі «Утварэнне СССР», «Утварэнне СССР— перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі», «БССР у дзевятай пяцігодцы».

Паспяхова выступілі па юбілейнай тэматыцы на заводзе «Калібр» студэнты IV курса гістфака В. Поргац, А. Бычкова, А. Каданчык, А. Канеўскі, Н. Рудакоўскі, а студэнты-юрысты — ў Стаўбцах.

Цёпла былі сустрэты выкладчыкі БДУ на падшэфным аўтамабільным заводзе. З цікавымі выступленнямі прыехалі сюды біёлагі — дацэнт Ф. М. Варонін, кандыдат навук А. М. Астапеня, дацэнты Е. С. Юрочка, Л. М. Лук'яновіч, выкладчыкі кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў кандыдат навук В. Ф. Ладысеў, дацэнт А. В. Ераксін, аспірант Л. В. Пугаўко, дацэнт М. Я. Рэзнікаў (фізфак); выкладчык О. І. Цітоў (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі), выкладчыкі Е. І. Шмаргунова, І. Ф. Рэкуц з кафедры гісторыі філасофіі і логікі, аспіранты В. С. Клімовіч, І. Ф. Раманоўскі (кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў), дацэнт В. В. Шчаглова (геафак); дацэнты Л. Н. Неакладнава, Л. І. Севасцьянава, кандыдат навук В. І. Сідэрка (хімфак); выкладчыкі Г. В. Грабешчанка, І. А. Смальцэр з кафедры навуковага камунізму; дацэнт С. А. Лысенка, выкладчыкі І. С. Страпанава і Д. В. Фёдараў, дацэнт І. П. Кахно — з філфака; студэнт V курса гістфака А. Злотнікаў. Свае выступленні яны прысвяцілі дню нараджэння У. І. Леніна.

На адбыўшымся 26 красавіка прэзідыуме праўлення таварыства «Веды» было вырашана правесці ў маі чатыры навукова-тэарэтычныя канферэнцыі: у гарадах Стаўбцы, Ліда, Астравец, Барысаў і калектыўны выезд брыгады вучоных у саставе 12 чалавек па рэспубліцы з лекцыямі, прысвечанымі 50-годдзю ўтварэння СССР.

За лепшую арганізацыю прапаганды эканамічных, тэхнічных, сельскагаспадарчых, прыродазнаўчых ведаў і перадавога вытворчага вопыту сярод моладзі арганізацыя таварыства «Веды» БДУ па выніках рэспубліканскага конкурсу удастоена І месца і узнагароджана дыпломам І ступені і грашовай прэміяй.

А. ГРЫЦКЕВІЧ.

АДЗНАЧАНА ПРАЦА КАНТРАЛЁРАЎ

Напярэдадні Першамая Кастрычніцкі раённы камітэт народнага кантролю аб'явіў падзяку за актыўны ўдзел у рабоце органаў народнага кантролю Д. М. Каруліну, старшыні ГНК геаграфічнага факультэта, М. А. Сакалову, кіраўніку сектара навуковай работы ГНК БДУ, А. Д. Андрэеву, кіраўніку сектара вучэбнай работы, М. Л. Багрый-Шахматаву, члену сектара аргмасавай работы, Л. В. Быліне, члену вучэбнага сектара.

Л. АГАРОДНІКАВА.

ЗНОЎ ПРЭМ'ЕРА

Вось ужо шмат гадоў студэнцкі тэатр універсітэта радуе нас сваімі новымі спектаклямі. Гэта «Маладая гвардыя» Фадзеева, «Дальняя дарога» Арбузава і іншыя. У гэтым годзе студэнцкі тэатр, якім кіруе заслужаны артыст Латвійскай ССР Аляксандр Міхайлавіч Озераў, падрыхтаваў новы спектакль па п'есе Л. Жухавіцкага «Адны, без анёлаў». Героі п'есы маладыя, як маладыя і самі выканаўцы.

Калектыў тэатра шмат папрацаваў не толькі над самой п'есай, але і над афармленнем спектакля. Увесь рэквізіт і касцюмы зроблены самімі рабятамі.

З новай работай тэатра усе жадаючыя змогуць пазнаёміцца 5 мая ў 19-30 у актавай зале галоўнага корпуса.

А. ДЗЕДУШКІН.

БЫЦЬ ПРЫГОЖЫМІ

Вясною прыхарошваецца не толькі прырода, але і людзі. Усе хочуць быць прыгожымі. Ну, а у 19 ці 20 год жаданне гэта павялічваецца ўдвая. Але калі ты студэнт і сродкі твае даволі скромныя, як тады ўраўнаважыць жаданні і магчымасці? Дапамагаюць гэта зрабіць работнікі мінскага Дома мадэлей. Ужо многа год займаюцца яны прапагандай моды і культуры адзення сярод насельніцтва. А зусім нядаўна прыйшлі ў госці да студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта.

Сустрэчу вядзе мастацтвазнаўца Валянціна Міхайлаўна Капусцінская. Яна гаворыць аб напрамках сённяшняй моды, аб праблеме «Моладзь і мода».

— Не трэба імкнуцца да непатрэбнага моднічання. Няцяжкія і недарагія тканіны, напрыклад, Гродзенскага тонкасуконнага камбіната, рухомыя, лятаючыя формы толькі падкрэсляць вашу маладосць. Галоўнае, каб усё ваша адзенне было прасякнута юным задорам, светлым настроем маладосці і прыгажосці.

У апошні час многа гаворыцца на тэму «Мода і ты сам». У гэтым напрамку Валянціна Міхайлаўна прапанавала кожнаму мець свае пераканані. Трэба браць з моды толькі тое, што ідзе табе. Пры гэтым улічваць рост, паўнату, характар, і галоўнае, памятаць правіла: усе рэчы павінны адпавядаць па колеру, форме, прызначэнню. Толькі тады можна купляць новую рэч, калі ўпэўнішся, што яна неяк дастасуецца да другога адзення ў гардэробе.

Некаторыя лічаць, што дзяўчына ў штанах — з'ява недапусцімая. А мастакі-мадэльеры прытрымліваюцца іншай думкі. Як сказала В. М. Капусцінская, у зручных сучасных камплектах адзення няма нічога ганебнага. Усё залежыць ад таго, які выгляд мае чалавек і як сябе паводзіць. Надзяваючы бручны касцюм, трэба мець адчуванне такту, меры, не скажаць моду. Нічога дрэннага не будзе ў тым, калі студэнтка, якая добра займаецца і вызначаецца прыкладнымі паводзінамі, дазволіць сабе надзець такі касцюм.

Мода будуецца на законе адмаўлення. Тое, што здавалася нам незвычайным учора, сёння становіцца прывычным. Толькі трэба не баяцца гэтага новага, але і не злоўжываць ім.

Л. ПЕРАСЫПКІНА.







АБ СТУДЭНЦЕ 70- х...

Нядаўна студэнты V групы II курса юрыдычнага факультэта правялі дыспут «Студэнт 70-х гадоў. Які ён?».

Прыняць удзел у спрэчках былі запрошаны студэнты факультэта журналістыкі. Атрымалася шчырая, сардэчная гутарка. Цікавыя думкі выказалі студэнты Ліля Радчук, Галя Гінзбург, Віктар Пратаповіч, Віктар Кубека і іншыя. Шчырымі і слушнымі былі выступленні выкладчыцы кафедры гісторыі КПСС Т. Я. Галко і прадстаўніка радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» Я. Р. Радкевіча. Гэта была гутарка і аб паводзінах студэнтаў, аб «патрэбных і непатрэбных» прадметах, аб жыцці людзей, якія носяць ганаровае званне — студэнт. Не было абыякавых да гэтай гутаркі. І дыспут «Студэнт 70-х гадоў. Які ён?» атрымаўся цікавым і карысным.

І. СЦЯПУРА,
студэнт.

Спорт

УСЕ ЎЗРОСТЫ ПАКОРНЫ ГПА

Першага сакавіка ў нашай краіне стартаваў новы ўсесаюзны фізкультурны комплекс ГПА. Ён стаў сапраўднай праграмай і нарматыўнай асновай савецкай сістэмы фізічнага выхавання. Новы комплекс вызначае сабой свядомыя адносіны да заняткаў фізкультурай і спортам савецкіх людзей усіх узростаў. ГПА ўладаром ідзе па краіне, шчодра раздаючы ад малога да вялікага сілу і здароўе. У гэтыя дні наш карэспандэнт сустрэўся са старшынёй спартыўнага клуба Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна Славамірам Канстанцінавічам Камінскім, які адказаў на некалькі пытанняў.

— Скажыце, калі ласка, што зроблена ва універсітэце па падрыхтоўцы да здачы новага комплексу?

— З першых дзён існавання новага комплексу ГПА ва універсітэце была створана камісія па арганізацыі і здачы нарматываў. Кіруе работай камісіі прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С. А. Умрэйка. У камісію ўвайшлі прадстаўнікі ваеннай кафедры, камітэта камсамола, кафедр грамадзянскай абароны і фізкультуры і спорту, старшыня камітэта ДТСААФ, прадстаўнікі мясцовага камітэта і іншых грамадскіх арганізацый. Акрамя гэтага, так сказаць, галоўнага штаба, на факультэтах таксама створаны камісіі па прыёму норм новага комплексу ГПА. Факультэцкімі камісіямі распрацаваны ў сваю чаргу каляндарныя планы па прыёму норм новага комплексу.

— З якіх відаў спорту пачалі выкананне праграмы ГПА і які парадак здачы нарматываў комплексу?

— З лыжных спаборніцтваў. На лыжню выйшлі 2 тысячы 580 чалавек. Нарматыў новага комплексу выканалі тысяча дзвесце пяць чалавек. У спартыўных залах праходзіць здача нарматываў па гімнастыцы, аджыманню ад падлогі або штурханню штангі. Я сказаў «або» таму, што гэтыя два віды комплексу здаюцца па выбару.

У сакавіку ў басейнах горада нашы студэнты здавалі нарматыў па плаванню. У цяперашні час універсітэта студэнты, супрацоўнікі і выкладчыкі выконваюць нарматыў ГПА па стральбе.

З першым цяплом мы выйшлі на стадыёны і спартыўныя пляцоўкі. Нарматывы па бегу, скачках, кіданню гранаты паспяхова выканалі студэнты фізічнага факультэта і самага маладога факультэта — прыкладной матэматыкі. Мне прыемна адзначыць, што з самых першых спаборніцтваў студэнты факультэта прыкладной матэматыкі праяўляюць самую вялікую актыўнасць, а галоўнае — масавасць.

— Вядома, што здача новых норм комплексу ГПА праводзіцца на спаборніцтвах. Як ва універсітэце гэта пытанне рашаецца практычна, улічваючы ўзрост?

— Новы комплекс ГПА складаецца з пяці ўзроставых ступеней. Яго асаблівасць у тым, што ўстаноўлены нарматывы па ўсіх відах і для ўсіх узростаў. Ва універсітэце здаюцца нарматывы па дзвюх ступенях— IV і V, у якія ўваходзяць узроставыя групы ад 19 да 60 гадоў. Таму на спаборніцтвах, праводзімых паміж факультэтамі, камісія ўлічвае ўзрост члена каманды, і выкананы ім нарматыў парауноўваецца з нарматывамі дапай узроставай групы новага комплексу.

— Новы комплекс ГПА прадугледжвае здачу нарматываў па тэорыі. Што Вы можаце расказаць аб падрыхтоўцы студэнтаў, супрацоўнікаў і выкладчыкаў да здачы тэарэтычнай часткі новага комплексу?

— У самым пачатку здачы нарматываў мы ставілі галоўнай задачай выявіць тых удзельнікаў, хто не ўкладваецца ў нарматывы па тых або іншых відах. На працягу пэўнага тэрміну пад кіраўніцтвам трэнераў гэтыя ўдзельнікі будуць рэгулярна трэніравацца. А з верасня на факультэтах будуць праводзіцца семінары, на якіх студэнты і выкладчыкі азнаёмяцца з тэорыяй новага комплексу ГПА. Таксама будуць праводзіцца публічныя лекцыі па грамадзянскай абароне. Выкладчыкі кафедры фізкультуры і спорту азнаёмяць з элементарнымі практыкаваннямі ранішняй гімнастыкі для ўсіх узроставых груп. Будуць прачытаны лекцыі аб карысці загартоўвання.

— Па якіх відах цяпер ідзе выкананне нарматываў і колькі чалавек ужо выходзіла на старты і выходныя рубяжы новага ўсесаюзнага фізкультурнага комплексу ГПА?

— З пачатку існавання новага комплексу ва універсітэце адбыліся і праводзяцца спаборніцтвы па стральбе, плаванню, гімнастыцы. Здаюцца нарматывы па лёгкай атлетыцы, па кіданню гранаты. Пачынаючы з мая, будуць працягвацца турыстычныя паходы.

За гэты час у праводзімых спаборніцтвах па выкананню новых фізкультурных нарматываў ГПА прынялі ўдзел каля чатырох тысяч двухсот васьмідзесяці чалавек. Ужо цяпер можна з упэўненасцю сказаць, што новы комплекс ГПА садзейнічае свядомым адносінам да заняткаў фізкультурай і спортам людзей усіх узростаў.

Інтэрв'ю правёў
М. ІНІН.

АТ 01717
Зак. 553.
Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
Тыраж 2 000 экз.
Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.